Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 1. С. 40–44.

УДК 378.016:39

UDC 378.016:39

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫ КАМПАНЕНТ У ФАРМІРАВАННІ ПРАФЕСІЙНЫХ НАВЫКАЎ ПЕДАГОГАЎ ЭСТЭТЫЧНАГА ПРОФІЛЮ

# ETHNO-CULTURAL COMPONENT IN THE FORMATION OF PROFESSIONAL SKILLS OF TEACHERS OF AESTHETIC PROFILE

**Н. Г. Мазурына,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры тэорыі і методыкі*
*выкладання мастацтва БДПУ*

**N. Mazuryna,**
*Candidate of Philology, Associate Professor*
*theory and methods of teaching art BSPU*

Паступіў у рэдакцыю 13.12.16.

Received on 13.12.16.

У артыкуле разглядаюцца пытанні месца і ролі этнакультурнага кампанента ў фарміраванні прафесійных навыкаў педагогаў эстэтычнага профілю. Даследуюцца фундаментальныя ўласцівасці народнай творчасці: калектыўнасць, традыцыйнасць, сінкрэтызм, варыянтнасць, якія з'яўляюцца асноватваральнымі і для педагагічнай дзейнасці. Гэта служыць базай для распрацоўкі інавацыйных форм і метадаў навучання і развіцця пры фарміраванні прафесійных навыкаў педагогаў эстэтычнага напрамку (настаўнікаў музыкі, рытмікі і харэаграфіі, сусветнай і айчыннай мастацкай культуры, выяўленчага мастацтва, педагогаў дадатковай адукацыі).

*Ключавыя словы:* этнічная культура, народная педагогіка, прафесійныя навыкі, эстэтычная адукацыя, фальклор.

The article questions the place and role of ethno-cultural component in the formation of professional skills of teachers of aesthetic profile. Such fundamental properties of folk art as collectivity, traditionality, syncretism, variance are also fundamental to teaching. This serves as the basis for the development of innovative forms and methods of training and development in the formation of professional skills of teachers of aesthetic direction (teachers of music, rhythm and dance, world and national art culture, the fine arts, additional education).

*Keywords:* ethnic culture, folk pedagogic, professional skills, aesthetic education, folklore.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Для сучаснай Беларусі адукацыя застаецца важнейшым інструментам захавання яе самабытнага месца сярод іншых краін свету, яе міжнароднага прэстыжу як краіны, якая валодае высокім узроўнем культуры і навукі. У XXI ст. адукацыя выступае галоўным механізмам аднаўлення грамадскага інтэлекту, у выніку чаго ЮНЭСКА абвясціла бягучае стагоддзе «векам адукацыі». Змена гісторыка-культурнай сітуацыі ў краіне і ў свеце ставіць перад сістэмай адукацыі новыя задачы, якія будуць вырашацца пры ўмове дастатковай колькасці адпаведным чынам падрыхтаваных педагогаў. Чалавек фарміруецца, выхоўваецца ў першую чаргу асобай настаўніка. Таму выкладчык павінен быць значным як актыўны носьбіт культуры і этнакультуры, гістарычных ведаў, як прадстаўнік народа, застаючыся сучасным чалавекам.

Фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнасцяў эстэтычнага напрамку (будучых настаўнікаў музыкі, рытмікі і харэаграфіі, сусветнай і айчыннай мастацкай культуры, выяўленчага мастацтва, педагогаў дадатковай адукацыі) прафесійных навыкаў педагогаў у працэсе навучання ў ВНУ – гэта складаны працэс засваення сістэмы светапоглядных універсалій, якія ў нашай краіне, як і ў любой іншай, складваюцца ва ўмовах своеасаблівага нацыянальнага гісторыка-культурнага развіцця.

Атмасфера сумеснага музіцыравання (харавых і сольных спеваў, ігры на музычных інструментах), танцаў, мастацкай творчасці, вырабу твораў традыцыйнага прыкладнога мастацтва натуральна змяшчаюць добразычлівасць, разуменне, увагу да асобы студэнта, павагу да старэйшых, жаданне прыняць ад іх асабісты вопыт музыкі і мастака, эстэтычны і гістарычны вопыт народа. Умелыя педагогі насычаюць працэс навучання імкненнем да пошуку, жаданнем знаходзіць, спрабаваць, ствараць, ісці далей па шляху пазнання. У такім асяроддзі педагогі павінны валодаць універсальнымі ведамі ў галіне культуры і мастацтва, быць носьбітамі эстэтычных і этычных каштоўнасцяў, нацыянальнай культуры, дакладна ведаць, як і што менавіта перадаваць сваім вучням, студэнтам. Ідэальна, калі

выкладчыкі вышэйшай школы валодаюць прафесійнай кампетэнтнасцю ў сферы мастацтва і традыцыйнай культуры, а таксама злучаюць у сваёй дзейнасці навуку і практыку, гісторыю і сучаснасць, шырокі агульнакультурны кругагляд і паглыбленае валоданне прадметам выкладання.

У гэтым аспекце асаблівую цікавасць уяўляе сабой *народная культура*, якая ўключае тры базісныя складовыя часткі: матэрыяльную культуру, культуру сацыяльнага кіравання (дакладней – самакіравання) і духоўную культуру. Апошняя мае такія структурныя элементы, як народны светапогляд, народная маральная культура, народная педагогіка, народная мастацкая культура, народная эканамічная культура, народная правасвядомасць.

У сучаснай філасофіі сфармулявана паняцце «светапоглядныя ўніверсаліі», якія датычаць сацыяльнага жыцця чалавецтва. В. С. Сцёпін падкрэслівае: «Светапоглядныя ўніверсаліі выконваюць у жыцці грамадства такую ж функцыю, як і гены ў жывым арганізме. Яны арганізуюць у цэласную сістэму найскладаны набор розных феноменаў культуры і выступаюць у якасці базісных структур сацыякода, адыгрываюць ролю свайго роду ДНК сацыяльнага жыцця» [1, с. 18]. Ён лічыць функцыянаванне ўніверсалій культуры падобным на ролю ДНК як своеасаблівай матрыцы сінтэзу бялкоў і іншых рэчываў. З яго пункту гледжання, «сістэма светапоглядных універсалій – гэта своеасаблівы культурна-генетычны код, у адпаведнасці з якім утвараюцца сацыяльныя арганізмы» [1, с. 18].

Арганічнае злучэнне гісторыі, культуры, фальклору і традыцый сям'і, малой радзімы, краіны фарміруе духоўнае адзінства, якое павінна прыняць, усвядоміць і засвоіць моладзь. Дапамагчы ім у гэтым галоўная задача не толькі ўстаноў адукацыі, але і пазашкольных устаноў: цэнтраў творчасці, устаноў культуры, бібліятэк і г. д. З гэтай мэтай у рэспубліцы ладзяцца творчыя конкурсы, акцыі, якія дапамагаюць па-новаму ўбачыць традыцыі і абрады беларусаў, аб'екты гісторыі, культуры сваёй мясцовасці, далучыцца да творчага пошука, праявіць сябе ў розных сферах дзейнасці.

Фальклор як сфера мастацкай творчасці, якая развівае менавіта вобразны бок мыслення асобы, належыць да ліку найбольш эфектыўных сродкаў выхавання творчай асобы будучага педагога.

Сучасная педагогіка фарміравалася і дзейнічае на аснове народнай, узяўшы найлепшую і найглыбейшую чалавечую мудрасць і здабыткі навукі народаў свету. Зразумела, што кожны народ стварае сваю адукацыю з улікам нацыянальнай спадчыны. Беларуская этнапедагогіка як навука аб народнай педагогіцы ўзнікла дзякуючы даследаванням Г. П. Арловай, Г. А. Барташэвіч, В. С. Болбаса, Л. М. Варанецкай, А. А. Грымацэ, І. І. Калачовай, У. М. Конана, А. Ю. Лозкі, Л. В. Ракавай, С. В. Снапкоўскай, І. І. Сучкова, В. С. Цітова і інш. Пад *народнай педагогікай* разумеюць сукупнасць поглядаў і ідэй, навыкаў і прыёмаў, сродкаў і метадаў традыцыйнага выхавання і перадачы працоўных, рамесніцкіх, бытавых, агранамічных, жывёлагадоўчых, матэматычных, батанічных, медыцынскіх, метэаралагічных, касмалагічных, каляндарных, маральных, эстэтычных і іншых традыцыйных ведаў і навыкаў, набытых шматгадовым эмпірычным (вопытным) шляхам [2, с. 5].

Гэтае азначэнне стасуецца з думкай адной з пачынальнікаў беларускай этнапедагогікі Г. П. Арловай [3] і аўтараў выдання «Эстэтычная педагогіка беларусаў», дзе сцвярджаецца: «Народная педагогіка разумеецца... як сукупнасць эмпірычных ведаў і навыкаў навучання і выхавання, што склалася ў традыцыйнай культуры (даіндустрыяльнай, беспісьмовай, сельскагаспадарчай) і перадаецца ў этнакультурных традыцыях, народнай паэтычнай і мастацкай творчасці, устойлівых формах зносін дзяцей паміж сабой і дарослымі» [4, с. 14].

Народная педагогіка беларусаў звязана не толькі з агульнай педагогікай, але і з гісторыяй, літаратурай, этнаграфіяй, фальклорам, народнай культурай, мастацтвам, этыкай, эстэтыкай, беларусазнаўствам. Яна мае свае сродкі, спосабы і прыёмы выхавання і навучання, якія будуць далей разглядацца. У этнапедагагічнай дзейнасці сучаснымі педагогамі выкарыстоўваюцца пераважна вусная вербальная і музычная народная творчасць. А пры падрыхтоўцы студэнтаў па спецыяльнасцях напрамку выяўленчага мастацтва і народных мастацкіх промыслаў важнае месца належыць традыцыйнаму дэкаратыўна-прыкладному мастацтву.

Мастацтва ў цэлым з'яўляецца сродкам захавання і перадачы рацыянальнага і эмацыянальнага вопыту чалавецтва. Спецыфіка традыцыйнага харэаграфічнага, музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў заключаецца ў тым, што яны даводзяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да свядомасці досвед зносін са з'явамі мастацтва, здабываюць з народных мастацкіх твораў неабходны духоўны матэрыял. Ён, у сваю чаргу, забяспечвае развіццё самога чалавека, яго духоўных сіл і ўніверсальных здольнасцяў. Яны тым самым спрыяюць развіццю творчага стаўлення да свету, фарміраванню матывацыі да пастаяннай творчай актыўнасці.

Этнапедагагічная дзейнасць па сваім характары і сродкам уздзеяння аказваецца шмат у чым блізкай дзейнасці мастацка-творчай, вобразна-стваральнай. Яна толькі ў тым выпадку будзе эфектыўнай, калі не абмяжуецца ўздзеяннем на ўзроўні розуму, логікі, але актыўна выкарыстоўвае вобразны бок светаўспрымання. Такая форма прафесійнага навучання грунтуецца на галоўнай мэце народнай педагогікі – выхаванні чалавека, асобы, Творцы.

Адна з неабходных кампетэнцый, якую сучасныя выкладчыкі павінны фарміраваць у студэнтаў, будучых педагогаў эстэтычнага профілю, – гэта ўменне адэкватна, творча рэагаваць на выклікі часу, бачыць перспектыўныя шляхі свайго развіцця, здольнасць жыць не толькі сённяшнім днём. Д. С. Ліхачоў вылучаў у якасці асабліва значнай характарыстыкі чалавечай асобы яе «маральную аседласць», маючы на ўвазе пад гэтым веды культуры свайго народа, любоў да сваёй Бацькаўшчыны, сям'і, дому [5]. Разуменне ўсяго гэтага можна знайсці ў традыцыйнай народнай культуры і мастацтве, паколькі вывучэнне іх не абмяжоўваецца толькі авалодваннем тэхнічнымі навыкамі выканання, але і абуджае ў выканаўцы і карыстальніку нацыянальную самасвядомасць, фарміруе нацыянальны этыка-эстэтычны ідэал пры ўключэнні ў сусветны культурны тэкст.

Для народнага мастацтва і культуры характэрны такія рысы, як традыцыйнасць, пераемнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм, арыентаванасць на нацыянальны этычны і эстэтычны ідэал, жыццярадаснасць, глыбокая павага да Майстра, Настаўніка.

*Сінкрэтызм* этнакультурных кампанентаў служыць асновай для інавацыйнай адукацыйнай дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў, выпрацоўкі інавацыйных адукацыйных тэхналогій, прапанаваных асобнымі калектывамі ці педагогамі. У педагагічнай, філасофскай, культуралагічнай, іншай навуковай літаратуры не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце пастаянна гучыць слова «цэласнасць» як галоўная тэндэнцыя фарміравання сучаснага культурнага тэксту. Сінкрэтызм народнага мастацтва ўтварае фундамент гэтай цэласнасці (інтэграцыі) і можа выкарыстоўвацца ў адукацыйнай дзейнасці педагагічных работнікаў усіх прыступак сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі.

Непадзельнасць, цэльнасць, сінкрэтызм этнакультурных з'яў і працэсаў з'яўляецца перадумовай для распрацоўкі тэарэтычных прынцыпаў інтэграванага падыходу як асновы падрыхтоўкі сучасных спецыялістаў. Педагагічная інтэграцыя выяўляецца пашырэннем функцыі адукацыі (інтэгратыўная функцыя); інавацыйным навучаннем (інтэграванае навучанне); мадэрнізацыяй адукацыі (інтэграваныя тэхналогіі), вынікам адукацыі (цэласная асоба). Выкарыстанне сінкрэтызму традыцыйнага мастацтва дазваляе ажыццяўляць выхаванне суб'екта пэўнага этнасу.

Такая агульная для педагагічнай і фальклорнай дзейнасці асаблівасць, як *калектыўнасць*, дае магчымасць уключаць у сучасную педагагічную практыку тое, што цяпер вызначаюць як універсальнасць зместу адукацыі і міждысцыплінарны падыход у навукова-даследчай дзейнасці. Калектыўнасць народнага мастацтва вызначаецца асаблівай формай яго стварэння і спажывання, у якой творца і спажывец аказваюцца, з пункту гледжання долі іх творчага ўдзелу ў працэсе, практычна раўнапраўнымі. Міждысцыплінарны падыход найбольш ярка праяўляецца пры навучанні студэнтаў па такіх спецыяльнасцях, як, напрыклад, «Сусветная і айчынная культура. Фальклор», «Выяўленчае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы». Настаўнік і вучань, выкладчык і студэнт выступаюць раўназначнымі ўдзельнікамі працэсу прафесійнай падрыхтоўкі, злучаючы тэорыю і практыку, навуку і прафесійную дзейнасць, ствараючы творчую атмасферу навучання і выхавання будучага мастака, музыканта, харэографа, педагога. Адбываецца працэс перадачы і прывіцця навыкаў вядзення навучальных заняткаў, ажыццяўлення даследчага пошуку, знаходжання інавацыйных рашэнняў праблем, якія ўзнікаюць. Гэта і ёсць асноўны прынцып этнічнай культуры, мастацтва, педагогікі. Натуральна, што выкладчык і студэнт, майстар і вучань застаюцца галоўнымі бакамі цэласнай адукацыйнай сістэмы, выступаюць раўнапраўнымі суб'ектамі працэсу навучання і выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прынцып калектыўнасці абапіраецца на *традыцыйнасць*. З традыцыйнасцю пераклікаецца прынцып гістарызму, які складае адзін з кампанентаў тэорыі развіваючага навучання В. У. Давыдава і Э. Д. Эльконіна. «Гістарызм» у якасці прынцыпа неабходна разглядаць як некаторую найважнейшую «канстанту» фарміравання бесперапыннасці і цэласнасці чалавечых ведаў у пастаянна зменлівых духоўных і матэрыяльных умовах развіцця, а таксама ў ходзе змен аб'ектыўнага зместу фундаментальных навуковых тэорый. Да іх прымыкае і *пераемнасць*, якая дазваляе будучаму спецыялісту знайсці сваё месца ў сучасным соцыуме, набыць уменне пластычна ўпісвацца ў інавацыйную эканоміку, культуру, адукацыю трэццяга тысячагоддзя.

Варта звярнуць увагу і на яшчэ адзін аспект праявы калектыўнасці ў дачыненні да эстэтычнай педагогікі і этнапедагогікі. Этнічная карціна свету адлюстроўвае ўяўленні народа аб навакольным свеце, уключае ў сябе духоўныя, матэрыяльныя, мастацкія, сацыяльныя аспекты, якія знаходзяць адлюстраванне ў творах народнага мастацтва. Асноўным аб'ектам этнічнай карціны свету, яе кропкай вымярэння, з'яўляецца чалавек, прадметам выступаюць уяўленні чалавека, яго веды, творчасць, дзейнасць. Яе ўсведамленне дазволіць маладому чалавеку не толькі сфарміравацца як творчай індывідуальнасці, але і набыць такую якасць, як уменне «працаваць у камандзе». На гэтай аснове цалкам магчыма фарміраванне такіх рысаў, як творчае стаўленне да справы, набыццё ўменняў арганізоўваць калектыўную працу, падпарадкоўваць асабістыя інтарэсы задачам найлепшага выканання агульнага творчага задання, знаходзіць арыгінальныя рашэнні ў практычнай прафесійнай дзейнасці, паважліва ставіцца да калег і навакольных. Творчасць уяўляе сабой натуральную форму працы свядомасці. З гэтага пункту гледжання, традыцыйнае і прафесійнае мастацтва можна разглядаць як пастаяннае ўпітванне і прысваенне, бесперапынную эмацыянальную працу ва ўсе перыяды чалавечага жыцця.

Неабходным уяўляецца прыцягнуць увагу да *аптымізму*, *жыццярадаснасці* твораў традыцыйнай культуры і мастацтва. Іх формы, гучанне, каларыстыка, тэматыка, настрой спрыяюць фарміраванню высокаэстэтычнага прадметнага і духоўнага асяроддзя жыцця. Гэтым падтрымліваецца псіхічнае і фізічнае здароўе чалавека.

Здароўезберажэнне ўяўляе сабой адзін з асноўных прынцыпаў традыцыйнага мастацтва. З гэтым звязана тэхналогія біаадэкватнага выкладання, якую сучасныя педагогі ацэньваюць як здароўезберагальны метад, які спрыяе актывізацыі ўсіх патэнцыяльных магчымасцяў асобы. Такі метад адносіцца да пошукава-тэхналагічнай мадэлі інавацый (улічвае рацыянальны і эмацыянальны бакі пазнання), арыентаваны на развіццё цэласнага мыслення, на фарміраванне ўмення мысліць вобразамі, пры выкарыстанні якога падключаюцца ўсе каналы ўспрымання інфармацыі, што робіць працэс выкладання выніковым [6, с. 68].

Супастаўленыя такім чынам асаблівасці эстэтычна-педагагічнай і этнакультурнай дзейнасці генетычна маюць шмат агульнага. Для іх характэрны такія рысы, як традыцыйнасць, пераемнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм, варыятыўнасць, арыентаванасць на нацыянальны этычны і эстэтычны ідэал, жыццярадаснасць, глыбокая павага да Майстра, Настаўніка. Гэта служыць базай для распрацоўкі інавацыйных форм і метадаў навучання і развіцця пры фарміраванні прафесійных навыкаў педагогаў эстэтычнага напрамку (настаўнікаў музыкі, рытмікі і харэаграфіі, сусветнай і айчыннай мастацкай культуры, выяўленчага мастацтва, педагогаў дадатковай адукацыі). У практычнай дзейнасці гэта рэалізуецца па-рознаму ў залежнасці ад кірунку падрыхтоўкі студэнтаў у галіне музычнага, харэаграфічнага, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў, што можа стаць тэмай наступных артыкулаў.


Літаратура

1. *Степин, В. С.* Философия и эпоха цивилизационных перемен / В. С. Степин // Вопросы философии. – 2006. – № 2. – С. 16–26.
2. *Лозка, А. Ю.* Беларуская фалькларыстыка : Народная педагогіка і дзіцячы фальклор : вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка. – Мінск : БДПУ, 2012. – 102 с.

References

1. *Stepin, V. S.* Filosofiya i epokha tsivilizovannykh peremen / V. S. Stepin // Voprosy filosofii. – 2006. – № 2. – S. 16–26.
2. *Lozka, A. Yu.* Belaruskaya falklarystyka : Narodnaya pedagogika i dzitsyachy falklor : vucheb.-metad. dapam. / A. Yu. Lozka. – Minsk : BDPU, 2012. – 102 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. *Арлова, Г. П.* Народная педагогіка як сродак выхавання вучняў : дапам. для педагогаў агульнаадукац. установ і ўстаноў пазашк. выхавання і навучання / Г. П. Арлова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – 144 с.
4. *Болбас, В. С.* Эстэтычная педагогіка беларусаў : манаграфія / В. С. Болбас, І. С. Сычова. – Мазыр : Белы Вецер, 2011. – 197 с.
5. *Лихачёв, Д. С.* Письма о добром / Д. С. Лихачёв. – СПб. : Изд-во «LOGOS», 2006. – 256 с.
6. *Марковская, Е. А.* Биоадекватная технология преподавания как инновационная технология развития целостного мышления учащихся / Е. А. Марковская // Современные технологии высшего образования : материалы круглого стола 19 мая 2010 года. – СПб. : МИЭП, 2010. – С. 58–70.

3. *Arlova, G. P.* Narodnaya pedagogika yak srodak vykhavannya vuchnyau : dapam. dlya pedagogau agulnaadukats. ustanou i ustanou pazashk. vykhavannya i navuchannya / G. P. Arlova. – Minsk : Nats. in-t adukatsyi, 2009. – 144 s.
4. *Bolbas, V. S.* Estetychnaya pedagogika belarusau : managrafiya / V. S. Bolbas, I. S. Sychova. – Mazyr : Bely Vetser, 2011. – 197 s.
5. *Likhachyov, D. S.* Pisma o dobrom / D. S. Likhachyov. – SPb. : Izd-vo "LOGOS", 2006. – 256 s.
6. *Markovskaya, Ye. A.* Bioadekvatnaya tekhnologiya prepodavaniya kak innovatsionnaya tekhnologiya razvitiya tselostnogo myshleniya uchashchikhsya / Ye. A. Markovskaya // Sovremennyye tekhnologii vysshego obrazovaniya : materialy kruglogo stola 19 maya 2010 goda. – SPb. : MIEP, 2010. – S. 58-70.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ